практычнай задачай з'яўляецца вызначэнне зместу, метадаў, прыёмаў, форм навучання ў адпаведнасці з уласцівасцямі асобы, якія ў найбольшай ступені ўплываюць на вучэбную работу і праяўляюцца ў ёй. Рэалізацыя выпрацаванага зместу і адпаведных яму прыёмаў у вучэбна-метадычных комплексах, і перш за ўсё у падручніках, створыць магчымасці для эфектыўнага ажыццяўлення дыферэнцыраванага навучання ў школе.

[1] Гл.: Педагогика / Под ред. Г. Нойнера, Ю. Бабанского. М., 1984. С. 334.
[2] Рубинштейн С. Л. // Вопросы психологии. 1960. № 3. С. 3.

І. К. ГЕРМАНОВІЧ

# М. І. ГЕТМАНСКІ ЯК МОВАЗНАВЕЦ І МЕТАДЫСТ

Вядомы беларускі мовазнавец і метадыст Міхаіл Ільіч Гетманскі нарадзіўся 1 студзеня 1916 г. (18 снежня 1915 па старому стылю) у вёсцы Балыкіна былога Пагарскага павета Бранскай губерні ў сялянскай сям'і. Пачатковую адукацыю атрымаў у мясцовай школе, а няпоўную сярэднюю — у раённай сямігодцы, якую скончыў у 1931 г. Далейшы жыццёвы шлях М. І. Гетманскага непарыўна звязаны з Беларуссю, куды яго сям'я пераехала на пастаяннае жыхарства.

З 1932 г. М. І. Гетманскі працаваў у Мінску чорнарабочым на заводзе імя Мяснікова і адначасова вучыўся на вячэрнім рабфаку пры Беларускім дзяржаўным універсітэце, а ў 1934 г. стаў студэнтам філалагічнага факультэта Мінскага вышэйшага педагагічнага інстытута. На прадапошнім курсе вучобу спалучаў з выкладчыцкай працай у Мінскім педтэхнікуме, дзе вёў практычныя заняткі па методыцы беларускай мовы. У нявопытнага юнака спачатку не ўсё ладзілася. Вось чаму дырэкцыя параіла яму звярнуцца за дапамогай да Я. Коласа, які перад гэтым выкладаў методыку ў тэхнікуме некалькі гадоў. Я. Колас сустрэў маладога спецыяліста добразычліва, пракансультаваў па многіх пытаннях, доўга гутарыў аб розных сакрэтах прафесіі метадыста. У працэсе гутаркі ён адразу распазнаў у М. І. Гетманскім патэнцыяльныя даследчыцкія здольнасці і пазней зрабіў усё неабходнае для іх выяўлення і развіцця. Пра гэта М. І. Гетманскі праз трыццаць гадоў ва ўспамінах «Незабыўны настаўнік» пісаў: «Зімой 1938 года я выпадкова сустрэўся з паэтам у Інстытуце мовазнаўства АН БССР. Тады паэт займаў тут пасаду віцэ-прэзідэнта. Павітаўся з ім. Думаў, што Я. Колас ужо не памятае мяне, але ён спытаў, як справы ў тэхнікуме. Калі ж даведаўся, што я заканчваю інстытут, параіў паступаць у аспірантуру Акадэміі навук. Аб гэтым паэт сказаў і прафесару Ломцеву. Пазней той гутарыў са мной, спасылаючыся на параду Я. Коласа. Так я стаў аспірантам па беларускай мове ў Інстытуце мовазнаўства. Але мне хацелася займацца методыкай мовы. Я. Колас адобрыў маё жаданне, напісаў просьбу ў Міністэрства асветы РСФСР аб выдзяленні кіраўніка і камандзіраваў мяне ў Маскву. Навуковага кіраўніка ў тым годзе мне не змаглі выдзеліць, але параілі працягваць вучобу ў Інстытуце педагогікі. Гэта мяне не задавальняла. Я папрасіўся на прыём да Н. К. Крупскай. Надзежда Канстанцінаўна адобрыла маё імкненне, але адзначыла, што ў мяне невялікі вопыт, і параіла папрацаваць некалькі гадоў у школе, працягваючы здачу экзаменаў у аспірантуры. З гэтым згадзіўся і Я. Колас» (Камуніст Палесся (Мазыр). 1972. 1 ліст.).

Прызнаўшы слушнасць парад Н. К. Крупскай і Я. Коласа, М. І. Гетманскі ўладкаваўся выкладчыкам рускай мовы і літаратуры ў Глускай сярэдняй школе. Аднак педагагічная праца і завочная аспіранцкая вучоба з 1939 г. былі надоўга перапынены службай у Чырвонай Арміі. М. І. Гетманскаму давялося прымаць удзел у баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, перажыць горыч адступлення з заходняй граніцы да самай Масквы і радасць перамогі ў Берліне. Ён быў некалькі разоў паранены і кантужаны, узнагароджаны баявымі ордэнамі і медалямі.

Пасля дэмабілізацыі з арміі М. І. Гетманскі працаваў (1947—1953) метадыстам у Бабруйскім абласным інстытуце ўдасканалення настаўнікаў, а потым — загадчыкам педагагічнай практыкі ў Бабруйскім педвучылішчы, завучам гарадскіх сярэдніх школ. Увесь гэты час ён працягваў перапыненую вайной вучобу ў аспірантуры ўжо пры Акадэміі педагагічных навук РСФСР і рыхтаваў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Вывучэнне фанетыкі рускай мовы ў пятым класе школ з беларускай мовай выкладання: Роля фанетыкі ў развіцці ў вучняў правільнага вымаўлення і арфаграфічных навыкаў», якую абараніў у 1959 г. З 1961 г. працаваў у Мазырскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя Н. К. Крупскай старшым выкладчыкам, затым дацэнтам кафедры рускай мовы, некаторы час загадваў гэтай кафедрай. Выкладчыцкую дзейнасць паспяхова спалучаў з навуковай, асабліва многа ўвагі аддаючы напісанню доктарскай дысертацыі на тэму «Асновы методыкі навучання рускаму літаратурнаму вымаўленню, націску і інтанацыі ў IV—VIII класах школ з беларускай мовай выкладання». Дысертацыя была ўжо фактычна завершана і падрыхтавана да абароны, але абарона не адбылася ў сувязі з раптоўнай смерцю аўтара 22 сакавіка 1977 г.

Пяру М. І. Гетманскага належыць звыш двухсот навуковых публікацый: манаграфій, брашур, артыкулаў, тэзісаў дакладаў на розных метадычных і мовазнаўчых канферэнцыях, рэцэнзій. Тэматыка іх вельмі шырокая, але пераважаюць публікацыі, прысвечаныя актуальным педагагічным і метадычным пытанням.

У 1961 г. М. І. Гетманскі выдаў невялікую кніжку «Изучение русского языка в связи с развитием речевых и орфографических навыков». Паколькі адной з прычын арфаэпічных і арфаграфічных памылак у рускай мове беларусаў з'яўляецца ўплыў роднай мовы і мясцовых гаворак, то аўтар асноўную ўвагу засяродзіў менавіта на ёй. У першай главе ён падрабязна разгледзеў асноўныя адрозненні адных і тых жа гукаў у блізкароднасных мовах (зычны гук *г* у беларускай мове фрыкатыўны, а ў рускай — выбухны, зычны гук *ч* у беларускай мове цвёрды, а ў рускай — мяккі і г. д.), рознае вымаўленне адных і тых жа гукаў у аднолькавых фанетычных пазіцыях (беларускае яканне, дзеканне, цеканне і інш.), несупадзенне месца націску ў некаторых аднакарэнных словах і граматычных формах (*íмя — имя́, фартýх —фáртук, брáла —брала́* і г. д.). У другой і трэцяй главах дадзены метадычныя парады, як трэба ўлічваць гэтыя адрозненні пры вывучэнні на ўроках пэўных праграмных тэм, прыведзены нават тэксты практыкаванняў і пісьмовых работ для замацавання і праверкі атрыманых вучнямі навыкаў. Кніга была цёпла прынята настаўнікамі і станоўча ацэнена спецыялістамі.

Гэтым фанетычным і арфаграфічным памылкам як выніку міжмоўнай беларуска-рускай інтэрферэнцыі М. І. Гетманскі ўдзяліў увагу і ў сваёй манаграфіі «Исправление недостатков речи у школьников» (1970), але адвёў ім толькі адну невялікую главу. Астатнія ж пяць глаў прысвяціў моўным дэфектам школьнікаў, абумоўленым фізіялагічнымі прычынамі — недасканаласцю будовы і функцый іх артыкуляцыйнага апарату або парушэннем слыху. Менавіта па гэтых прычынах у маўленні некаторых дзяцей наглядаецца пропуск у словах асобных гукаў (*ама* замест *рама, алка* замест *галка, іса* замест *ліса, каандаш* замест *карандаш* і інш.), замена аднаго гука другім (*коска* замест *кошка, друзна* замест *дружна, дубы* замест *зубы, тырк* замест *цырк, упата* замест *лапата, вак* замест *рак, лублу* замест *люблю* і інш.), заіканне, дызартрыя (невыразнасць маўлення), рыналалія (непрыемнае насавое адценне пры вымаўленні гукаў), алалія (адсутнасць здольнасці гаварыць пры нармальных слыху і разумовых здольнасцях) і некаторыя іншыя маўленчыя дэфекты. Яны нярэдка да школы знікаюць самі па сабе, аднак некаторыя захоўваюцца ў дзяцей і ў школьным узросце. Так, з 345 абследаваных аўтарам манаграфіі вучняў пачатковых класаў Мазырскай сярэдняй школы № 4 картавасць наглядалася ў 25, няправільнае вымаўленне шыпячых — у 29, свісцячых — у 19, замена пры маўленні адных гукаў другімі — у 12 і г. д. Маўленчыя дэфекты адмоўна ўплываюць на

псіхічнае развіццё дзяцей (развіваецца сарамлівасць, пачуццё непаўнацэннасці) і на іх паспяховасць па ўсіх прадметах, асабліва па мовах. Напрыклад, устаноўлена, што вучні з маўленчымі дэфектамі робяць на пісьме памылак у 3—5 разоў больш, чым вучні з нармальным маўленнем. Вось чаму маўленчыя дэфекты трэба своечасова выпраўляць. Займаюцца гэтым спецыяльныя лагапедычныя ўстановы. А паколькі яны ёсць нават не ва ўсіх гарадах, то карэкцыю недахопаў лёгкай і сярэдняй ступені пры наяўнасці вучэбных дапаможнікаў могуць і павінны праводзіць настаўнікі пачатковых класаў і выкладчыкі-моваведы. Такім вучэбным дапаможнікам для іх і стала гэтая манаграфія М. І. Гетманскага. У ёй аўтар не толькі прааналізаваў маўленчыя дэфекты некаторых школьнікаў, абумоўленыя фізіялагічнымі прычынамі, але і даў настаўнікам вельмі карысныя парады, як кожны з іх выпраўляць, карыстаючыся прасцейшымі медыцынскімі інструментамі і, галоўнае, праз прадуманую сістэму моўных практыкаванняў.

Свае думкі і папярэднія напрацоўкі па развіццю культуры рускай мовы беларускіх школьнікаў М. І. Гетманскі абагульніў і паглыбіў у кнізе «Методика работы над устной речью в школе» (1973), задуманай як дапаможнік для студэнтаў філалагічных факультэтаў і факультэтаў педагогікі і методыкі пачатковага навучання педагагічных інстытутаў Беларусі. Яна складаецца з дзесяці глаў, у якіх асвятляюцца такія тэарэтычныя і практычныя пытанні, як прычыны арфаэпічных і інтанацыйных памылак ў мове навучэнцаў, асноўныя арфаэпічныя правілы рускай літаратурнай мовы, націск у рускай і беларускай мовах, методыка навучання літаратурнаму вымаўленню, работа над літаратурным вымаўленнем у працэсе паўтарэння вывучанага ў пачатковай школе, работа над літаратурным вымаўленнем у працэсе вывучэння фанетыкі, работа над літаратурным вымаўленнем у працэсе вывучэння марфалогіі, работа над інтанацыяй у працэсе вывучэння сінтаксіса, усваенне літаратурнага вымаўлення і інтанацыі на ўроках літаратуры, работа над літаратурным вымаўленнем і інтанацыяй у пазакласны час. Шмат цікавых лінгвістычных звестак і моўных фактаў пададзена ў пяці дадатках да асноўнай часткі кнігі: 1) Матэрыял для практыкаванняў па арфаэпіі і інтанацыі; 2) Наглядныя дапаможнікі па арфаэпіі; 3) Словы, у якіх найбольш дапускаюцца памылкі ў вымаўленні; 4) Прыметнікі, у якіх змяняецца націск пры ўтварэнні кароткіх форм; 5) Слоўнічак дзеясловаў, у якіх пераносіцца націск на канчатак у формах жаночага роду прошлага часу.

Вельмі цікавая брашура «Эстетическое воспитание детей в семье» (1962), напісаная М. І. Гетманскім у сааўтарстве з В. С. Брандабоўскім. Яна адрасавана бацькам. Аўтары, вызначыўшы мэты і задачы эстэтычнага выхавання, зусім справядліва лічаць, што яно павінна праводзіцца комплексна: праз быт, працу, прыроду і мастацтва ва ўсіх яго разнавіднасцях — літаратуру, музыку, жывапіс, кіно, тэатр. Кожнаму з гэтых аспектаў у брашуры прысвечаны асобны раздзел. У раздзелах дадзены канкрэтныя парады, як трэба выкарыстоўваць быт, працу, прыроду і мастацтва для эстэтычнага выхавання, прыведзены яркія прыклады з гісторыі і вопыту некаторых сем'яў Беларусі, парэкамендаваны нават разгорнутыя планы гутарак з дзяцьмі па творах мастацкай літаратуры і жывапісу. Брашура была і застаецца карыснай не толькі для бацькоў, але і для настаўнікаў.

М. І. Гетманскі часта выступаў у друку з атрыкуламі аб выкарыстанні параўнальнага метаду ў выкладанні беларускай і рускай моў, аб эфектыўнасці прымянення на ўроках тэхнічных сродкаў, аб рабоце метадычных кабінетаў, аднакамплектных і малакамплектных школ і г. д. Вельмі карысныя яго артыкулы (а іх больш за 20), у якіх абагульняецца педагагічны вопыт лепшых настаўнікаў гарадскіх і сельскіх школ. Уважліва сачыў вучоны за навінкамі мовазнаўчай і метадычнай літаратуры і часта адгукаўся на іх змястоўнымі рэцэнзіямі.

Творчая спадчына М. І. Гетманскага не страціла сваёй тэарэтычнай і практычнай вартасці, яна працягвае служыць нашым настаўнікам і бацькам дашкольнікаў і школьнікаў.